СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Мядзведзь. Рарог. Луг. Пленэр. Бяда. Дом. Воўк. Дакар. Дача. Атака. Зубр. Сом. Дума. Рашата. Рак. Аўра. Мір. Марс. Одра. Разак. Брага. Нуда. Ліга. Фараон. Трак. Корж. Горад. Нага. Лось. Украіна. **Па вертыкалі:** Ліса. Урадпік. Маўр. Нява. Акрабат. Форта. Расол. Роў. Сафа. Мара. Гак. Ікар. Конь. Догляд. Ізюбр. Абора. Удод. Тло. Рагу. Агама. Брак. Наждак. Кара. Ват. Шаман. Раса. Азу. Кот. Рад. Меладрама. Скарбонка.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ХОУМ КРЕДИТ БАНК»

г. Минск, ул. Одоевского, 129, 220018, Республика Беларусь
Тел.: (8017) 229 89 91, www.homecredit.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2011 года

ОАО «ХКбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2011	01.04.2010
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	2 388,8	209,4
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	68 655,9	5 026,3
5	Средства в банках	1104	21 027,5	14 064,0
6	Ценные бумаги	1105	-	-
7	Кредиты клиентам	1106	239 605,3	139 320,2
8	Производные финансовые активы	1107	13 394,9	12 827,0
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	10 602,3	5 858,6
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	-	-
12	Прочие активы	1111	16 296,4	9 633,2
13	ИТОГО активы	11	371 971,1	186 938,7
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	64 017,7	-
16	Средства банков	1202	95 874,0	-
17	Средства клиентов	1203	79 851,3	88 935,7
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	-	-
19	Производные финансовые обязательства	1205	1 650,8	2 092,5
20	Прочие обязательства	1206	2 545,6	1 885,5
21	ВСЕГО обязательства	120	243 939,4	92 913,7
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	62 287,0	62 287,0
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	3 114,3	3 114,3
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	1 056,9	262,9
27	Накопленная прибыль	1215	61 573,5	28 360,8
28	ВСЕГО капитал	121	128 031,7	94 025,0
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	371 971,1	186 938,7

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2011 года

ОАО «ХКбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2011	01.04.2010
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	6 497,4	5 891,7
2	Процентные расходы	2012	2 964,4	1 681,6
3	Чистые процентные доходы	201	3 533,0	4 210,1
4	Комиссионные доходы	2021	25 389,4	17 283,3
5	Комиссионные расходы	2022	1 227,6	792,1
6	Чистые комиссионные доходы	202	24 161,8	16 491,2
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(5 861,4)	1 487,3
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	5 544,3	(2 660,7)
11	Чистые отчисления в резервы	207	1 229,9	877,8
12	Прочие доходы	208	2 223,6	869,8
13	Операционные расходы	209	10 762,2	5 626,4
14	Прочие расходы	210	1 429,4	537,0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	16 179,8	13 356,5
16	Налог на прибыль	212	2 724,1	2 321,8
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	13 455,7	11 034,7

Председатель Правления **Табатадзе А.Н.**

Главный бухгалтер **Глазырина О.В.**

Дата подписания «08» апреля 2011 года.

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 18 от 29.11.2007 г.
Свидетельство о государственной регистрации № 807000056 от 10.07.2002 г. УНП 807000056.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.10	20.10	14.00
Віцебск —	5.57	20.03	14.06
Магілёў —	6.00	20.01	14.01
Гомель —	6.00	19.54	13.54
Гродна —	6.25	20.25	14.00
Брэст —	6.29	20.22	13.53

Месяц

Поўня 18 красавіка.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Палікарпа, Ціта.*

К. *Анастасіі, Базыля, Вацлава, Цэзара.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сын абліў маці кіслатой

63-гадовая гамяльчанка трапіла ў бальніцу са шматлікімі хімічнымі апёкамі цела. Непрацуючы збіў маці, нажом абрэзаў ёй валасы і абліў кіслатой.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МАХЛЯР НЕ РАЗМЕНЬВАЎСЯ НА ДРОБЯЗІ

27-гадовы віцябчанін «выбіваў» шматмільённыя кантракты з гандлёвымі фірмамі.

Патэнцыйных ахвяр, паводле звестак прэс-афіцэра Цэнтральнага РУУС Святланы Кабковай, сталічныя фірмы, якія рэалізуюць тавары з адтэрміноўкай плацяжу, прайдзісвет знаходзіў па інтэрнэце. Затым, прадстаўляючыся прадстаўніком гандлёвага таварыства, ён прапаноўваў прадаўцам заключыць кантракт. Між іншым, для гэтага ён меў адпаведныя дакументы і штампы, якія, зразумела ж, былі падробнымі. Падкупляла прадаўцоў і тое, што знешне малады чалавек выглядаў вельмі рэспектабельна, да таго ж добра «малоў» языком...

Вынікам умелай «апрацоўкі» работнікаў фірмаў станавіліся шматмільённыя кантракты і адгрузка прадукцыі. Толькі ў Мінску за кароткі час хітрун ад імя ТАА, якога не існавала, заключыў аптовыя дагаворы з пяццю гандлёвымі фірмамі, арганізаваў вываз тавару і яго продаж у Мінску і Віцебску. Аднак «наслядзіў» махляр не толькі ў сталіцы: у Віцебску ім таксама зацікавіліся мясцовыя праваахоўнікі за аналагічныя махінацыі, але падазроны своечасова зразумеў гэта і разгарнуў актыўную дзейнасць ужо ў Мінску. Дарэчы, каб перастрахавацца, ён таксама імкнуўся захоўваць і правілы канспірацыі: неаднаразова мяняў мабільнікі, сім-карткі, прыязджаў у фірмы на розных аўтамабілях. Не дапамагло: затрымалі прайдзісвета падчас чарговай здзелкі. Паводле меркавання следчых, зламыснік мог «засвяціцца» не толькі ў сталіцы і Віцебску, але і ў іншых гарадах краіны.

Ігар ГРЫШЫН.

ВЫБУХНУЎ БАЛОН ДЛЯ ЗВАРКІ

Здарэнне адбылося раніцай 13 красавіка ў жылым доме на вуліцы Ульянаўскай у Бабруйску.

У Магілёўскім абласным УМНС паведамілі, што работнікі прадпрыемства «Цеплаэнергетыка» рабілі зварку, і выбухнуў балон. Пацярпелі 36-гадовы майстар і 48-гадовы газазваршчык. Яны шпіталізаваныя з рознымі траўмамі. Выбухам разбіта шкло на ўваходзе ў пад'езд і на лесвічнай клетцы аднаго з паверхаў, пашкоджаны тры прыпаркаваныя побач аўтамабілі. Прычына выбуху высвятляецца.

Ілона ІВАНОВА.

ЗАБІЎ І СХАВАЎ У КУФРЫ

54-гадовага жыхара в. Вуйвічы (Пінскі раён) знайшлі мёртвым у куфры.

Судова-медыцынская экспертыза ўстанавіла, што гаспадар атрымаў 5 колата-рэзаных ран сэрца і лёгкіх. Аператыўнікі выйшлі на забойцу — 36-гадовага аднавяскоўца, які пасля сумеснай выпіўкі, 4 дні таму, забіў заточаным напільнікам сабутэльніка, а цела потым схаваў у куфар.

Забойца раней ужо быў асуджаны за рабаванне.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ІХ НЕ ВЯРНУЦЬ, АЛЕ ДАВАЙЦЕ ЗАХАВАЕМ ХОЦЬ БЫ ПАМЯЦЬ...

Словы скончыліся... У сваякоў і блізкіх ўжо не хапае сіл ні гаварыць, ні плакаць. Яны ціха стаяць з чырвонымі вачыма і прыкладаюць насоўкі то да носа, то да вачэй. То да носа, то да вачэй. Здаецца, што яны хочуць схавацца ад свайго гора за гэтай насоўкай. Але насоўка — гэта ўсяго толькі кавалак тканіны... Напэўна, гэта гучыць жудасна, але ўсе пахаванні нечым падобныя. Калі на іх глядзіш збоку.

Шчыра прызнаюся, што я не магла стрымаць слёз, калі прысутнічала на пахаванні Наталлі Абражэй. Я бачыла яе ў першы і апошні раз. У першы. І апошні. Гучыць звыкла і банальна, але вы толькі ўдумайцеся як след у гэтыя словы! Я бачыла, як ніхто ніколі не зможа дапамагчы несуцешнаму 23-гадоваму сыну Наталлі Яўгену пераджыць гэтую трагедыю, звыкнуцца з такой заўчаснай стратай. Чамусьці мне думаецца, што раптоўная смерць страшней не для саміх памерлых, а для іх родных і блізкіх. Бо для іх — гэта шок. Здрадніцкі ўдар лёсу ў спіну.

Наталлю Абражэй хавалі на Паўночных могілках ля Мінска. Развітацца з ёй, прыгожай жыццярадаснай 44-гадовай жанчынай, прыйшло і прыехала шмат людзей. З усёй Беларусі. Шмат аднагрупнікаў і аднакурснікаў, што вучыліся з ёй у эканамічным універсітэце (былым наргасе) і якіх жыццё раскідала па ўсёй краіне, сабралася на пахаванні. Сяброўка Валянціна прыехала з Магілёва:

— Я даведалася пра трагедыю па радыё, пачула яе прозвішча... І адразу не магла паверыць. Жэнечку вельмі шкада, ён такі ласкавы, добры хлопец, вельмі прывязаны да маці... У нядзелю Наталля з нашымі агульнымі сяброўкамі, што ў Мінску жывуць, збіраліся на ўлазіны да адной з іх. У нас вельмі дружная універсітэцкая група, мы часта сустракаемся. Яны ў нядзелю ўвечары разышліся. А ў панядзелак здарылася непапраўнае...

Ніна Георгіеўна, сяброўка матулі Наталлі Валянцінаўны, прыехала з Нарачанскага краю. Але сама яна родам з Маладзечна. Як і Наталля. Там прайшло яе сонечнае дзяцінства. Дзеці Ніны Георгіеўны сябравалі з Наталляй, яе сястрой і братам. Сябравалі сем'ямі.

— Як уласнае дзіцё хаваю, — гаворыць скрозь слёзы Ніна Георгіеўна. — А як шкада! Такім яна была добрым чалавекам! Такая шпаркая, вясёлая, быццам спяшалася жыць, быццам усё хацела паспець. Усё ёй было цікава. Яна працавала бухгалтарам у Ракаве на дрэваапрацоўчай фабрыцы. Ехала з працы. І калі б электрычка прыйшла хоць крышачку раней альбо пазней, то гэтага б не здарылася...

Можна шмат гаварыць і пісаць, і думаць. Але самае страшнае, што гэтых цудоўных людзей, якія загінулі 11 красавіка 2011 года ў мінскім метро, ужо не вернеш. Ніяк. Нам застаецца толькі памятаць і шанаваць. А гэтая трагедыя нябачнымі ніткамі звязала кожнага з нас. Бо краіна ў нас не надта ўжо вялікая. І колькі сваякоў, сяброў і знаёмых былі звязаны з кожным з памерлых 11 красавіка. І як блізка яны адчулі смерць. Несправядлівую. Незаслужаную. Злую. І як каварна і ўмела яна аб'яднала такіх розных і па ўзросце, і па прафесіі людзей: 44-гадовага бухгалтара Наталлю Абражэй, сына алімпійскага прызёра Рамана Капцюха, зусім маладых юнакоў Юрыя Клімца і повара адной з мінскіх кавярняў Сяргея Сярбаева, Сяргея Герасімчыка, які б у ліпені мог адзначыць паўналецце, Ганну Шагойку, Аляксандра Парфунцава, выпускніцу Лінгвістычнага ўніверсітэта 27-гадовую Вольгу Салаўёву, Таццяну Захаркову, Віталя Бакана, Галіну Пікулік, супрацоўніцу РВУ «Літаратура і мастацтва» і яе мужа афіцэра Анатоля Наркевіча, што ехалі на дзень народзінаў 17-гадовай дачкі Анатоля Уладзіміравіча, у якой свята пераўтварылася ў жалобу, магчыма, на ўсё жыццё...

Наколькі кволае і безабароннае чалавечае жыццё. І наколькі яно, самае каштоўнае, што ёсць у людзей, абясцэнілася сёння. Наколькі лёгка знішчыць чалавека, прымусіць яго баяцца. І менавіта таму мы павінны стаць дабрэйшымі адно да аднаго, да сваіх родных і сяброў, павінны быць гуманнымі і чалавечнымі ў штодзённым жыцці, каб гэтае нашае дабро мела шанц на перамогу над злом. Мы павінны любіць адно аднаго, саміх сябе, простых людзей, тых, хто на працу ці вучобу ездзіць у метро. Мы павінны верыць сабе, быць уважлівымі да суайчыннікаў, спачуваць і дапамагаць простым людзям, такім, як мы самі.

Напэўна, трагедыя ў мінскім метро павінна змяніць беларусаў менавіта ў гэты бок. Бо толькі так мы зможам перамагчы зло, што прымусіла нас усіх скалануцца...

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ЛАЗАРАВА СУБОТА

Лазарава субота — гэта субота на шостым тыдні Вялікага посту — Вербным тыдні.

● У некаторых рэгіёнах у гэты дзень пяклі хлебцы згодна з колькасным складам сям'і. У адным з іх запякалі манету: каму яна трапляла, той лічыўся шчаслівым і яму прадказвалі поспех ва ўсіх пачынаннях на цэлы год. Дзяўчатам такая манета прадказвала хуткі і шчаслівы шлюб.

● У Лазараву суботу раілі сеяць гарох. Лічылася, што гэты дзень спрыяе яго ўрадлівасці.

● Калі ў наступную нядзелю з галінкамі вярбы прыходзілі дадому, трэба было выканаць шэраг рытуальна-магічных дзеянняў. Перш за ўсё пасцёбаць адно аднаго і пажадаць здароўя.

● Неабходна адзначыць, што ў славян такое рытуальна-магічнае дзеянне, як «біццё», было прадстаўлена даволі шырока ў сямейна-родавых абрадах і абрадах каляндарнага цыклу. Яно насіла прадуцыравальны і засцерагальны характар, а таксама спрыяла дзетанараджальнасці, урадлівасці, здароўю, набыццю моцы. Часцей за ўсё ў абрадзе «біцця» рытуальнае дзеянне выконвалі галінкамі вярбы, бярозы, крапівай, палкай ці дубцом, кнутом, хлебнай лапатай, поясам, венікам.

● На Палессі, пакуль выпякаўся вясельны каравай, усе жанчыны, якія знаходзіліся ў гэты час у хаце, павінны былі танчыць. Адна з іх у руках трымала хлебную лапату, якой яна павінна была дакрануцца (злёгку ўдарыць) да кожнай з прысутных.

● На Беларусі існаваў шэраг абрадаў, калі неабходна было выканаць рытуальнае дзеянне «біццё». Каб пладовыя дрэвы далі добры ўраджай у наступным годзе, падчас Каляд гаспадар павінен быў патрэсці або пабіць-пастукаць кожнае дрэва хлебнай лапатай. На Палессі ў калядныя вечары гаспадар запрашаў Мароза прыходзіць і пачаставацца кісялём. Пры гэтым трэба было моцна біць па штыкетніку, сцяне хаты ці па металічных прадметах: На Юр'я, калі першы раз выганялі карову ў поле, гаспадыня біла яе галінкамі асвячонай вярбы. На Палессі (в. Спорава Брэсцкай вобласці) у гэты дзень цяжарная жанчына здымала свой фартух, біла ім карову і выпраўляла ў поле. На Віцебшчыне існавала правіла: перш чым адправіцца на першае заворванне, заяц павінен быў пабіць (крыху) цешчу або цесця. Гэта рабілася дзеля таго, каб вырас добры ўраджай пшаніцы або жыта.

● Разам з тым, у народнай культуры існаваў шэраг забарон у дачыненні да гэтага рытуальнага дзеяння. Напрыклад, пад страхам смерці забаранялася біць зямлю.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дзіцячая тэма

ЛЯМБЛІЁЗУ — БОЙ!

Лямбліёз — шырока распаўсюджанае захворванне, якое выклікаецца мікраарганізмамі з сям'і прасцейшых — лямбліямі, што насяляюць тонкую кішку.

Калі разгледзець лямблію ў мікраскоп, то можна ўбачыць вельмі актыўную «істоту», якая перамяшчаецца па сценках кішэчніка з вялікай хуткасцю. Лямбліёз перадаецца рознымі шляхамі. Самы распаўсюджаны — фекальна-аральны: цысты лямбліі трапляюць у рот і далей у кішэчнік, дзе інфекцыя і развіваецца. (Дарэчы, цысты — форма існавання паразіта ў выглядзе капсулы з цвёрдай абалонкай, што дазваляе яму пераносіць розныя ўздзеянні знешняга асяроддзя без усялякай шкоды для сябе; цысты ўстойлівыя да кіслот, шчолачаў, рэчываў з актыўным хлорам; цалкам абясшкоджваюцца толькі пры кіпячэнні.) Ад заражанага лямбліямі чалавека ў навакольнае асяроддзе выдзяляецца вялізная колькасць цыстаў. З аднаго грама дзіцячых фекалій можа выдзеліцца да 300 тыс. цыстаў, а з аднаго грама дарослых — да 12 млн цыстаў. Іх выдзяленне адбываецца кожныя 8—14 дзён.

Адрозніваюць тры асноўныя шляхі распаўсюджвання лямбліёзу: водны, кантактна-бытавы і харчовы.

● Заражэнне адбываецца часцей за ўсё пры ўжыванні дрэнна ачышчанай водаправоднай вады або вады з адкрытых вадаёмаў.

● У выпадку кантактна-бытавога шляху заражэнне ажыццяўляецца праз прадметы ўжытку, забруджаныя цыстамі: бялізну, цацкі, посуд. У дзяцей, якія маюць шкодныя звычкі, такія, як кусанне пазногцяў, ручак, смактанне пальцаў і да т.п., практычна ў 100% выпадкаў выяўляюцца лямбліі.

● Магчымае заражэнне пры ўжыванні інфіцыяваных цыстамі харчовых прадуктаў, асабліва, калі яны ўжываюцца без тэрмічнай апрацоўкі.

Гэтыя каварныя прасцейшыя пашкоджваюць тонкі кішэчнік: яны шматразова прымацоўваюцца і адмацоўваюцца ад сценак кішэчніка, выклікаючы іх механічнае раздражненне. Пры гэтым адбываецца парушэнне ўсмоктвання вітамінаў, вугляводаў, бялкоў, а прадукты абмену, што выдзяляюцца лямбліямі, наадварот, усмоктваюцца і алергізуюць арганізм. Таксін лямблій уздзейнічае на нервовую сістэму: у хворага малога назіраецца прыгнечаны, дэпрэсіўны стан, ён можа раптоўна расплакацца, пакрыўдзіцца па дробязях, патрабуе павышанай увагі да сябе (невыпадкова нямецкі вучоны Д. Лямбль называў гэты мікраарганізм «паразітам нуды і суму»). Галаўны боль, раздражняльнасць, млоснасць, павышанае сэрцабіцце таксама не выключаюцца пры лямбліёзе. Акрамя іншага, гэтая інфекцыя характарызуецца дысфункцыяй тонкай кішкі: у хворага магчымае чарґаванне паносаў і запораў, адчуванне горычы ў роце, уздуцце жывата, агульнае недамаганне. Калі ваш малы схуднеў і не прыбаўляе ў вазе пры збалансаваным правільным харчаванні — гэта можа быць першай прыкметай інфекцыі.

Частая прыкмета пры лямбліёзе ў дзяцей і падлеткаў — пашкоджанне чырвонага беражка вуснаў. Ступень выражанасці бывае рознай: ад лёгкага лушчэння і сухасці, на якія хворыя не звяртаюць увагі, да моцнага запалення з трэшчынамі і заедамі.

Для вострай формы лямбліёзу характэрныя дыярэя працягласцю 5—7 сутак, метэарызм, болі ў верхняй частцы жывата, прыкметы інтаксікацыі (сінява пад вачыма, галаўны боль, стамляльнасць, ліхаманкавы стан).

Аднак не заўсёды развіццё лямбліёзу ў арганізме чалавека суправаджаецца нейкімі знешнімі прыкметамі, магчымае і бессімптомнае паразітаносьбітства.

Лячэнне лямбліёзу комплекснае і праводзіцца толькі ўрачом. Не дапускаецца самалячэнне, паколькі няправільна выбраная тактыка можа прывесці да пагаршэння стану і развіцця сур'ёзных пабочных рэакцый!

Урач выбірае тэрапію індывідуальна, у залежнасці ад узросту, масы цела, агульнага фізічнага стану дзіцяці. Звычайна прызначаюцца супрацьпаразітарныя прэпараты. У комплексе з імі ідуць жаўцягонныя, антыгістамінныя сродкі, ферменты. Далей магчымы курс біяпрэпаратаў, накіраваны на аднаўленне мікрафлоры кішэчніка. Для замацавання станоўчага тэрапеўтычнага эфекту, а таксама для аднаўлення слізістай абалонкі кішэчніка карысна правядзенне працяглай (1—2 мес.) фітатэрапіі.

Пры лямбліёзе з выражаным дыярэйным сіндромам рэкамендуецца дыета, якая ўключае прадукты з пекцінам у якасці натуральных сарбентаў: рысавы адвар, карацінаяблычная сумесь, чарнічны кісель, сухафрукты і інш.

Пажадана абмежаваць ужыванне салодкага, мучных вырабаў, паколькі менавіта вугляводная ежа з'яўляецца дадатковай энергетычнай сыравінай для лямблій.

Важна памятаць, што калі ў кагосьці выявілі лямбліёз, то, каб пазбегнуць паўторнага заражэння, лячыцца трэба ўсёй сям'ёй.

Самы эфектыўны і неабходны метад прафілактыкі лямбліёзу — гэта захаванне санітарна-гігіенічных нормаў:

● не піць сырую ваду — ужываць толькі гатаваную або толькі фільтраваную;

● старанна мыць рукі;

● садавіну і агародніну пасля мыцця дадаткова абліваць гатаванай вадой;

● быць асцярожнымі з прадуктамі з вулічных латкоў;

● пры наяўнасці хатніх жывёл рэгулярна праводзіць антыгельмінтныя апрацоўкі (мінімум раз у паўгода);

● дзяцей з няўстойлівым стулам пажадана абследаваць на носьбіцтва лямбліі.

Бацькам трэба як мага раней навучыць сваіх дзяцей правілам гігіены; адвучыць іх ад шкодных звычак грызці пазногці, алоўкі, ручкі, цацкі; забараніць ім даваць абліваць сябе сабакам і кошкам.

ДАПАЎНЯЕМ ЛЯЧЭННЕ ФІТАТЭРАПІЯЙ

● 2 ч. лыжкі здробненага лісця бярозы, сабранага ў чэрвені (г.зн. сярэдняй спеласці) заліць шклянкай кіпеню, настойваць 30 хвілін. Піць па 50 мл 3 разы на дзень за 30 хвілін да яды.

● Вазьміце роўнымі часткамі: пупышкі бярозы, траву крываўніку, кветкі календулы, кветкі рамонку, траву мяты, траву падтынніку, кветкі піжмы.

● Вазьміце роўнымі часткамі: траву дзядоўніку, траву падтынніку, пупышкі бярозы, шышкі вольхі, корань крывасмоку, траву цвінтарэю.

Зёлкі змешвайце ў сухім посудзе, які герметычна закрываецца, згодна з рэцэптам і захоўвайце ў сухім цёмным месцы. Для прыгатавання адвару заліце 2 ст. лыжкі збору 0,5 л кіпеню, настойвайце ноч у тэрмасе. Прымаць па 1/3—1/2 шклянкі 3—4 разы на дзень. Курс лячэння — 1—2 месяцы. Сутачная доза сухога лекавага збору прызначаецца ў залежнасці ад узросту: ад 1 года — 0,5—1 ч. лыжка; ад 1 да 3 гадоў — 1 ч. лыжка; ад 3 да 6 гадоў — 1 дэс. лыжка.

Увага! Перад тым, як прымаць той ці іншы збор, трэба азнаёміцца з супрацьпаказаннямі да траў і пераканацца ў адсутнасці алергічных рэакцый. Ну і, вядома ж, не забудзьце параіцца з доктарам.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

АЛЕІ ДРЭЎ — У ПАМЯЦЬ ПРА ЗАГІНУЛЫХ

Алеі лясных дрэў у памяць пра загінулых у сталічным метро плануецца закласці падчас акцыі «Тыдзень лесу-2011».

Прапановы аддаць такім чынам даніну памяці ахвярам тэракту паступаюць ад многіх удзельнікаў, прычым не толькі з Мінска, але і з іншых рэгіёнаў сталіцы, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.

Чакаецца, што сёлета ў акцыі возьмуць удзел звыш 30 тысяч чалавек. Лясныя насаджэнні зоймуць 5 тысяч гектараў. Усяго плануецца пасадзіць каля 30 мільёнаў дрэў. У лягсасах падрыхтавана больш за 800 спецыяльных аб'ектаў, на якіх добраахвотнікі змогуць папрацаваць: пасадзіць дрэвы, добраўпарадкаваць тэрыторыю, стварыць памятную алею ці закласці дэндрапарк. Акрамя таго, пройдуць пазнавальныя экскурсіі ў гадавальнікі, дэндрапаркі і паляўнічыя сядзібы. На працягу ўсяго тыдня лесаводы будуць сустракацца са школьнымі калектывамі і моладдзю.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Дзеля памяці

«РЭКВІЕМ»: БЕССМЯРОТНАСЦЬ

Сум паступова сыходзіць і замяняецца верай у жыццё. Туга невычарпальная... Боль страты непераможны. Здаецца... Але ўрэшце адчай адступае. Таму што верыш: чалавек працягвае жыць, нават калі фізічна яго няма. Душа бессмяротная. Яна не памірае, нават калі цела забіваюць. Яна вызваляецца і пераходзіць мяжу... Гэта «Рэквіем» Моцарта. Бессмяротная музыка — пра бессмяротнасць.

Яго выкананне адбылося ў вялікай зале «Белдзяржфілармоніі» 14 красавіка. Канцэрт, паводле слоў дырыжора Аляксандра Анісімава, быў задуманы яшчэ год таму. Сёлета «Рэквіем» збіраліся выконваць Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі і Дзяржаўны камерны хор у памяць пра чарнобыльскую аварыю. Потым адбылася катастрофа ў Японіі, і яе ахвяр збіраліся ўзгадаць у Беларусі. Але пасля 11 красавіка здарылася трагедыя, якая перакуліла беларускі свет... У філармоніі гучаў «Рэквіем».

— У панядзелак у 18 гадзін у нас заканчвалася рэпетыцыя з дзецьмі, а гэта метраў 100 ад метро, — распавёў Уладзімір Глушакоў, кіраўнік капэлы хлопчыкаў Рэспубліканскага музычнага каледжа, якая прымала ўдзел у канцэрце. — Але я прапанаваў праспяваць яшчэ адзін твор. Мы разыходзіліся на некалькі хвілін пазней, чым звычайна. Напэўна, Божая ласка існуе...

У Гендырэктара «Белдзяржфілармоніі» Аляксандра Гарбара ў той дзень у метро загінуў знаёмы. Трагедыя, якая нікога не пакінула раўнадушным. Яе можна аплакаць. Можна ўшанаваць памяццю. А можна музыкай, якая плача і ачышчае адначасова. Загадкавай і самай таямнічай музыкай у творчасці Вольфганга Амадэя Моцарта. Калі ён пачынаў пісаць гэты твор, то не чакаў сваёй смерці. Яна стала нечаканай, «Рэквіем» не дапісаны — была скончана толькі першая частка, і засталіся накіды.

— Музыка замяняе любыя словы, — падкрэсліла Наталля Міхайлава, кіраўнік Дзяржаўнага камернага хору Рэспублікі Беларусь. — Мы спяваем такія словы: «Асана ў вышынях Богу», — гэта дае надзею на тое, што ўсё будзе добра...

— Мова музыкі аднолькава зразумелая ўсім, — сказаў мастацкі кіраўнік «Белдзяржфілармоніі» Юрый Гільдзюк. — Таму на гэтай мове сваё спачуванне пацярпелым выказваюць вядомыя музыканты Беларусі. Тое, што здарылася, вучыць нас ашчадна ставіцца да культуры, якая з'яўляецца праявай самога жыцця. Культура можа дапамагчы прадухіліць шмат якія беды, таму што яна нясе духоўнасць, што спрыяе захаванню чалавечага ў чалавеку.

Канцэрт падтрымаў «Белзнешэканамбанк». Складаны і ўзвышаны твор Моцарта разам з камерным аркестрам, камерным хорам, капэлай хлопчыкаў выконвалі салісты беларускай оперы Настасся Масквіна, Аксана Волкава, Юры Гарадзецкі, Дзмітрый Капілаў. У гэты вечар гучаў і арган: польскі музыкант Ян Бакшчанін разам з аркестрам выканаў Канцэрт № 4 «Фа мажор». І тое, што зусім не планавалася: «Арыя» Грыга стала эпіграфам да канцэрта, у сувязі з той прычынай, пасля якой людзі ў Беларусі будуць узгадваць 11 красавіка.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1779. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12